

# Немагчыма ў вёсцы без гаспадаркі і... кветак

## Аператар машыннага даення ААТ «Княж» Шаркаўшчынскага раёна Ірына Андзілеўка — адна з 50 лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны»

**Па добрай традыцыі штогод у Віцебску ўшаноўваюць лепшых прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці і прафесій, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё вобласці па выніках мінулага года. Сярод іх — працаўнікі аграпрамысловага комплексу. Напрыклад, дырэктар ААТ «Шайцерава» Верхнядзвінскага раёна Міхаіл Гумнянкоў, начальнік свінагадоўчага комплексу СВК «Маяк Браслаўскі» Яўген Ракіцкі, аператар машыннага даення ААТ «Княж» Ірына АНДЗІЛЕЎКА, якая ў жывёлагадоўлі больш за дваццаць год.**

За добрасумленную працу неаднаразова прэміравалася на раённым узроўні, а па выніках 2023 года стала лаўрэатам ганаровага звання ў намінацыі «Аграпрамысловы комплекс, ахова навакольнага асяроддзя, лясная гаспадарка». На сцэне абласной філармоніі атрымала з рук старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Субоціна дыплом, нагрудны знак і грашовую прэмію.

— Мы ганарымся, што ў нашым калектыве ёсць такі руплівы работнік. На яе раўняюцца іншыя аператары машыннага даення, бяруць прыклад, — падкрэслівае старшыня прафкама гаспадаркі Таццяна Бохан. — Прысваенне ганаровага звання — чарговае прызнанне яе стараннай і вельмі неабходнай грамадству працы.

Гарадское жыццё ніколі не прываблівала вясковую дзяўчыну, яна заўсёды хацела жыць і працаваць у сельскай мясцовасці, на малой радзіме. Пасля заканчэння школы паступіла ў Глыбоцкае прафтэхвучылішча, атрымала кваліфікацыю швачкі-матарысткі. Спачатку была даяркай, потым узначальвала калектыў жывёлаводаў на фермах ля вёсак Жукі Горныя і Жукі Ложныя. Калі іх закрылі, уладкавалася аператарам машыннага даення на малочна-таварную ферму «Германавічы».

Сёння на МТФ 849 галоў буйной рагатай жывёлы, з якіх 422 каровы. Валавы надой па МТФ за мінулы год склаў 2,2 тысячы тон. У сярэднім ад адной рагулі атрымалі па 5208 кілаграмаў малака.

**Гарадское жыццё ніколі не прываблівала вясковую дзяўчыну, яна заўсёды хацела жыць і працаваць у сельскай мясцовасці, на малой радзіме.**

З году ў год Ірына дасягае высокіх вытворчых паказчыкаў не толькі ў сваёй гаспадарцы, але і сярод аператараў машыннага даення на раённым узроўні. Гурт яе кароў налічвае 53 галавы. Валавы надой малака за мінулы год — 347 тон. У сярэднім ад адной рагулі атрымала па 6553 кілаграмы. Не здае пазіцый Ірына Андзілеўка і сёлета.

З вясны і да позняй восені дом Ігара і Ірыны літаральна патанае ў рознакаляровых фарбах: гаспадыня старанна высаджвае кветкі, даглядае за імі. Нягледзячы на працоўную занятасць, жанчына знаходзіць час, каб захоўваць цяпло сямейнага ачага. У дзяцей ёсць уласныя сем'і. Юрый, вадзіцель на аўтамабілі хуткай дапамогі, жыве ў Полацку. Юлія ў мінулым годзе выйшла замуж, атабарылася ў Віцебску, працуе ў дзіцячым садку выхавальніцай. Часта наведваюцца да бацькоў, дапамагаюць па гаспадарцы. А яна ў Ігара і Ірыны даволі вялікая: дзве каровы, свінні, куры, гусі ды качкі. Без гэтага цяжка ў вёсцы пражыць. Да таго ж сыну і дачцэ трэба справіць ласункі і адправіць у горад.

**Сяргей РАЙЧОНАК**

**Фота аўтара**